Навіны

БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 14 (47)

22 траўня 2001 г.

*Заявы Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сілаў Беларусі*

## Пра статус і паўнамоцтвы г.зв. усебеларускага сходу

Паводле Канстытуцыі 1994 году, у Рэспубліцы Беларусь павінен існаваць падзел паўнамоцтваў паміж трыма галінамі ўлады: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Заканадаўчыя функцыі мае выконваць толькі легітымны прадстаўнічы орган – Вярхоўны Савет. Спробы надаць прадстаўнічую функцыю іншым інстытутам ня могуць мець праўных наступстваў.

Г.зв. усебеларускі сход, які склікаецца лукашэнкаўскім рэжымам, ня мае ніякай прадстаўнічасьці. Яго "дэлегаты" вылучаюцца паводле загадаў "вэртыкалі". Сход працягвае сумную традыцыю марыянэткавых тэатралізаваных збораў савецкіх часоў. Папярэднія зборні падобнага кшталту выкарыстоўваліся для падмацаваньня лініі на зьнішчэньне незалежнасьці Беларусі ды ўмацаваньне антыдэмакратычнага рэжыму. Сход, плянаваны на 18 траўня, паводле задумаў рэжымных ідэолягаў, павінен паслужыць стартам выбарчай кампаніі Лукашэнкі – за народныя грошы.

Ніякія рашэньні г.зв. усебеларускага сходу 18 траўня ня маюць юрыдычнай сілы, бо сход нікога не прадстаўляе й не зьяўляецца канстытуцыйным органам. Ніякія тэатралізаваныя прадстаўленьні за народны кошт не ўратуюць Лукашэнку ад ганебнай паразы на выбарах. Народ стаміўся.

## Аб дэкрэце №11 і спробах узмацніць інфармацыйную блякаду насельніцтва Беларусі

Каардынацыйная Рада дэмакратычных сілаў

Разглядае дэкрэт №11 "Аб некаторых захадах па ўдасканальваньні парадку правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў, іншых масавых мерапрыемстваў і пікетаваньня ў Беларусі" як супярэчны Канстытуцыі, фундамэнтальным

...цяг на стар 3.

vytoki.net




# Сойм БНФ выступіў за тэрміновае вызначэньне адзінага кандыдата

**19 траўня адбыўся Сойм БНФ "Адраджэньне". Ён стаў апошнім чарговым Соймам перад абвешчаньнем выбараў. Першым сярод абмеркаваных пытаньняў стаў лёс кааліцыі дэмакратычных сілаў (КРДС), а таксама стасункі КРДС і прэтэндэнтаў.**

Сойм даручыў кіраўніцтву БНФ (цяпер менавіта БНФ будзе старшыняваць у кааліцыі) на наступным жа паседжаньні дамагчыся прыняцьця рашэньня аб правядзеньні Кангрэсу дэмакратычных сілаў, а ў выпадку надзвычайнай сытуацыі галасаваньнем самой КРДС вызначыць імя адзінага кандыдата ад Каардынацыйнай рады. Сойм заклікаў прэтэндэнтаў скарыстаць апошні шанец і самім вызначыцца з тым, хто зь іх найбольш праходны.

Пасьля падпісаньня "пагадненьня пяцёх", дзе ёсьць такія сумнеўныя палажэньні, як "Саюз з Расеяй", Сойм БНФ "Адраджэньне" прапанаваў прэтэндэнтам, калі тыя хочуць быць сапраўды альтэрнатывай Лукашэнку, дакладна сфармуляваць іхнае стаўленьне да ключавых пытаньняў Беларускага жыцьця: лёс незалежнасьці, стасункі з Расеяй і іншымі дзяржавамі, бачаньне эканамічнай рэформы й дэмакратызацыі краіны.

На Сойме быў прыняты зварот пратэсту з нагоды сілавых разгонаў пратэсных акцыяў 18 траўня.

"Мы плянавалі Сойм як надзвычайны, – сказаў старшыня БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вінцук Вячорка, – мяркуючы, што на "ўсебеларускім сходзе" Лукашэнка выступіць зь ініцыятываю альбо названьня даты, альбо вызначыць сябе ў якасьці прэтэндэнта на кандыдацтва. Чаго, аднак, не адбылося. Гэта сьведчыць пра крайні раздрай, аслабленьне ў межах самой рэжымнай клікі, і магчыма, пра крах некаторых спадзеваў на расейскую падтрымку – бо вельмі шмат намаганьняў – прапагандовых, фінансавых, арганізацыйных – было ўкладзена ў падрыхтоўку гэтага спэктаклю. Тое, што ён закончыўся пшыкам, безумоўна, ёсьць удар для рэжыму Лукашэнкі".

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

## У дзень "сходу" – аблога ўправы БНФ

18 траўня з 18.00 памяшканьне БНФ "Адраджэньне" на вул. Варвашэні, 8 знаходзілася пад узмоцненай "аховай" АМАПу й асобаў у цывільным. Аблогу трымалі каля гадзіны.

Да ўваходу быў падагнаны аўтобус з амапаўцамі, акрамя таго, за сядзібай назіралі з шасьці машынаў насупраць. Міліцыянты правяралі асабістыя рэчы ўсіх, хто заходзіў у памяшканьне альбо выходзіў зь яго.

Не выклікае сумневаў, што аблога была зьвязана з правядзеньнем Лукашэнкам "другога ўсебеларускага сходу" – міліцыянты зьявіліся адразу ж пасьля затрыманьня на Кастрычніцкім пляцы пяці маладафронтаўцаў. Відавочна, што такія дэманстратыўна беззаконныя дзеяньні прадпрымаліся ўладамі дзеля запалохваньня актывістаў дэмакратычных сілаў у дзень чарговага "хуралу".

## Адбылася сустрэча з дэпутатам расейскай Дзярждумы

16 траўня адбылася сустрэча старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Вінцука Вячоркі й намесьніка старшыні Маладога Фронту Аляксея Шэіна зь сябрам фракцыі "Саюз правых сілаў" Дзяржаўнай Думы Расеі Вадзімам Бондарам па ягонай просьбе.

Госьця цікавіла грамадзка-палітычная сытуацыя ў Беларусі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Як зазначыў сп. Бондар, "стаўленьне да Лукашэнкі ў Расеі вельмі неадназначнае. Расейскія дэмакратычныя сілы, прынамсі СПС, будуць паважаць выбар беларускага народу".

Сп. Вячорка падкрэсьліў, што найбольш пільная ўвага замежных краінаў будзе важнай падчас рэгістрацыі дэмакратычнага кандыдата, а таксама ў часе самога галасаваньня. Таксама абмяркоўвалася пытаньне супрацоўніцтва паміж дэмакратычнымі сіламі Беларусі й Расеі.

**Прэсавая служба БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**



## Настаў час рашучых дзеяньняў

*Зварот Сойму БНФ "Адраджэньне"да арганізацыяў – сяброў Каардынацыйнае рады дэмакратычных сілаў і дэмакратычных прэтэндэнтаў у прэзыдэнты.*

Рэжым Лукашэнкі разгублены. Ён страціў палітычную ініцыятыву. Спэктакль пад назовам "усебеларускі народны сход" ганебна праваліўся. Папулярнасьць самога Лукашэнкі імкліва спадае. Шанец на перамогу дэмакратыі ў нашай краіне як ніколі вялікі, і мы ня маем права яго ўпусьціць.

Адзіная рэальная дэмакратычная кааліцыя, якая створана й дзейнічае ў Беларусі, – гэта КРДС. Яе ня можа падмяніць пагадненьне прэтэндэнтаў. Разам з тым БНФ "Адраджэньне" вітаў бы паразуменьне між прэтэндэнтамі: а) пагадзіцца вызначыць міжсобку адзінага кандыдата; б) не змагацца за ўплыў на ўжо існыя структуры, а ўлучаць у працу новых людзей.

Нас непакоіць недастатковая актыўнасьць прэтэндэнтаў, падтрыманых суб'ектамі КРДС. Грамадзтва чакае ад іх яскравых і сьмелых учынкаў, якія засьведчылі б іхны асабовы патэнцыял змагацца й кіраваць краінай. Але яшчэ больш нас турбуе адсутнасьць ясных праграмных палажэньняў, якія адказваюць на ключавыя пытаньні беларускае будучыні інакш, чым лукашэнкаўскія. Нікім не прызнаная міжнародна-праўная хімэра – г.зв. "саюз Беларусі й Расеі" – ня можа быць аргумэнтам у палітычнай барацьбе. Нельга спадзявацца на падтрымку палітычных партыяў, перадусім БНФ, і ў той жа час падпісваць заявы, якія супярэчаць сэнсу існаваньня гэтых партыяў. Мы чакаем, што прэтэндэнты агучаць, як яны бачаць незалежную будучыню Беларусі, нашай мовы, культуры й сымболікі, як зьбіраюцца ўкладаць стасункі з Расеяй, іншымі суседнімі краінамі, ЗША, краінамі Заходняй Эўропы, як зьбіраюцца вяртаць нашу краіну да дэмакратычнага ладу, як аздараўляць эканоміку.

Нельга аддаваць рэжыму і спн. Ярмошынай права вызначаць адзінага кандыдата. Кандыдат, якога падтрымаюць дэмакратычныя сілы краіны – сябры КРДС, павінен быць вызначаны да абвешчаньня выбараў і збору подпісаў за прэтэндэнтаў.

Сойм заяўляе: БНФ "Адраджэньне" і ўсе яго мясцовыя структуры будуць зьбіраць подпісы толькі за аднаго прэтэндэнта, якога вызначыць чарговы Кангрэс дэмакратычных сілаў. КРДС павінна выканаць сваё абяцаньне й вызначыцца з адзіным кандыдатам перад абвешчаньнем выбараў. У тэрміновым парадку гэта магчыма зрабіць праз галасаваньне самой Рады.

– Зьвяртаемся да КРДС з заклікам тэрмінова прызначыць дату чарговага Кангрэсу дэмакратычных сілаў;

– заклікаем кандыдатаў, названых суб'ектамі КРДС, выкарыстаць апошні шанец вылучыць адзіную кандыдатуру паміж сябе.

## Бясьсільная злосьць рэжыму

*Зварот Сойму БНФ "Адраджэньне"*

Гэтак званы ўсебеларускі народны сход, арганізаваны Лукашэнкам у тыпова савецкіх традыцыях, ганебна праваліўся. Не было вызначана ніводнай палітычнай ініцыятывы. Не прагучала адказу, як палепшыць катастрафічную эканамічную сытуацыю. Як і трэба было чакаць, зноў пацьвердзілася антыбеларуская лінія лукашэнкаўскага кіраўніцтва.

Рэжым ня мае што казаць народу. Таму ў злобнай істэрыцы ён аддае загады сілай разагнаць людзей, якія пратэстуюць супраць псэўдадэмакратычнага спэктаклю, якія нагадваюць пра бясьследна зьніклых палітычных апанэнтаў Лукашэнкі.

Сойм БНФ "Адраджэньне" патрабуе ўзбуджэньня крымінальнай справы супраць тых, хто вінаваты ў фізычнай расправе над дэманстрантамі 18 траўня 2001г.

**Менск, 19 траўня 2001 г.**

## Створаны новы рух

21 траўня адбыўся ўстаноўчы сход дзеля стварэньня грамадзкага руху "За абраньне народнага прэзыдэнта" (назва ўмоўная), на якім прысутнічалі магчымыя кандыдаты ў прэзыдэнты С. Домаш, М. Чыгір, Ул. Ганчырык, П. Казлоўскі, С. Калякін.

[illegible]наў, які вёў рэй, падк-[illegible]ы не апанэнты ніводнай з палітычных сілаў, нікога не падмяняем і гатовыя да супрацоўніцтва".

Старшынём выканкаму руху аднагалосна быў абраны В. Лявонаў, ягоным намесьнікам – І. Анташкевіч (19 траўня каля ўласнага дому ён быў жорстка зьбіты невядомымі. Спадар Анташкевіч адказваў за збор подпісаў пад зваротам да грамадзянаў Беларусі з мэтаю стварэньня вышэйназванага руху). У выканкам ўвайшлі паэты Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, а таксама Я. Лугін, Л. Карпенка, А. Гуляеў, І. Сярэдзіч і іншыя (усяго – 11 чалавек).

У другой палове дня павінны былі быць зацьверджаны канчатковая назва руху (магчыма, гэта будзе ня рух, а арганізацыя, кааліцыя) і дапрацаваны тэкст звароту, пад якім паставілі свае подпісы – на момант падпісаньня нумару ў друк – больш за 100 чалавек.

Увечары стала вядома, што гэтыя пытаньні мусяць быць вырашаныя рабочай групай пазьней.

**Э. К.**

vytoki.net

# Справа "Дня Волі" працягваецца

***10 траўня нечаканы працяг атрымалі падзеі "Дня Волі" 25 сакавіка.***

20 сакавіка, намесьнікам старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ сп. Сіўчыкам – адным з заяўнікў гэтай акцыі, у суд Маскоўскага раёну г.Менску была пададзеная скарга на незаконныя дзеяньні Менгарвыканкаму, які не дазволіў правядзеньня шэсьця.

Сп. Сіўчык не атрымаў ніякага адказу з суду і, калі па гэтай справе былі асуджаныя ўдзельнікі акцыі, ім была скіраваная яшчэ адна скарга ва ўпраўленьне юстыцыі на тое, што суд марудзіць і прынцыпова не зьбіраецца прымаць справу да разгляду.

10 траўня быў атрыманы адказ, датаваны 3 траўня 2001 г. У ім было паведамлена, што, як аказалася, сп. Сіўчыку было адмоўлена ў разглядзе гэтай справы рашэньнем суду ад 13 красавіка 2001 г. па фармальнай прыкмеце – за тое, што "ён не выканаў дасудовы парадак разгляду".

Паводле словаў прадстаўніка В. Сіўчыка ў судзе, сябра юрыдычнай камісіі БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ Уладзімера Лабковіча, "гэтыя дзеяньні цалкам парушаюць дзеючае беларускае заканадаўства. Па-першае, у той час, калі упраўленьне юстыцыі адмовіла ў прыняцьці скаргі, суд Маскоўскага раёну ўжо каля месяца на тэлефанаваньні сп. Сіўчыка і на пытаньні, калі будзе ягоная справа прынятая да суду, адказвае, што неўзабаве справа будзе разгледжаная, не паведамляючы аб тым, што справа адмененая. Па-другое, афіцыйнай паперы з суду аб адмене так і не паступіла. Акрамя таго, рашэньне суду парушае Закон аб шэсьцях, мітынгах і дэманстрацыях, які прадугледжвае толькі судовую спрэчку, а ніякага дасудовага парадку у ім не прадугледжваецца. Гэтым самым упраўленьне юстыцыі парушыла заканадаўства".

Дакумэнт, падпісаны начальнікам упраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму сп. Падлескім, сам па сабе выклікае вялікае зьдзіўленьне. Упершыню ў справаводчых дакумэнтах сустракаецца скарот "МГИ" (па-расейску: Минский городской исполнительны комитет) і спасылка на артыкул грамадзянска-працэсуальнага кодэксу, які, паводле словаў юрыста, "ня можа быць прыняты датычна гэтай справы". Гэта ўсё, паводле словаў сп. Лабковіча, "сьведчыць пра незаконныя дзеяньні суду, упраўленьня юстыцыі, ігнараваньне заканадаўчых нормаў Рэспублікі Беларусь і парушэніне правоў сп. Сіўчыка".



Вячаслаў СІЎЧЫК

Сам Вячаслаў Сіўчык адзначыў, што "гэта звычайная бюракратычная адпіска. Справаводчы ровень гэтай паперы не вытрымлівае аніякай крытыкі. Гэты выпадак сьведчыць аб нізкім роўні юрыстаў, якія абслугоўваюць рэжым. Чыноўнікам усё роўна прыдзецца адказваць за забарону правядзеньня Дня Волі, за парушэньне правоў менчукоў".

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**



*Пачатак на стар 1.*

## *Заявы Каардынацыйнай Рады дэмакратычных сілаў Беларусі*

правам і свабодам, што замацаваныя ўва Ўсеагульнай Дэклярацыі правоў чалавека, а таксама як грубае парушэньне выніковага дакумэнту Стамбульскага саміту, пад якім стаіць подпіс Лукашэнкі.

Расцэньвае факт перакрыцьця вяшчаньня расейскіх тэлеканалаў у Беларусі як працяг палітыкі задушэньня свабоды слова ў Беларусі й непрыхаваную форму шантажу расейскіх мас-мэдыя, а таксама як генэральную рэпэтыцыю татальнай інфармацыйнай блякады грамадзянаў Беларусі ў пэрыяд маючых адбыцца прэзыдэнцкіх выбараў.

Зьвяртае ўвагу грамадзянаў Беларусі й міжнароднай супольнасьці, што Аляксандар Лукашэнка, які страціў легітымнасьць пасьля ліпеня 1999 году, працягвае настойліва адхіляць шлях пошуку кампрамісу й згоды, не хаваючыся дэманструе стаўку на плян адміністрацыйна-сілавага правядзеньня прэзыдэнцкай кампаніі ў Беларусі.

Заклікае міжнародныя арганізацыі, нацыянальныя парлямэнты й ўрады адэкватна адрэагаваць на дзеяньні беларускіх уладаў, скіраваныя на далейшае пагаршэньне палітычнага клімату ў Беларусі.

Патрабуе ад Аляксандра Лукашэнкі скасаваць дэкрэт №11 і раней прыняты дэкрэт №8, а таксама прынесьці публічнае прабачэньне мільёнам тэлеглядачоў за парушэньне іхных правоў на вольны доступ да інфармацыі.

Прапануе з мэтай недапушчэньня ўзрастаньня канфрантацыі й сурацьстаяньня ў грамадстве не марудзячы пачаць прамыя перамовы паміж палітычнай апазыцыяй і урадам аб умовах правядзеньня маючых адбыцца прэзыдэнцкіх выбараў.

Заяўляе пра пачатак акцыі грамадзянскага непадпарадкаваньня выкананьню дэкрэту №11 як неадпаведнага Канстытуцыі й міжнародным абавязальніцтвам Рэспублікі Беларусь у сфэры правоў і свабодаў чалавека.

### Аб ініцыятыве збору подпісаў за міжнародную легітымізацыю незаконнай Палаты прадстаўнікоў

Нагадваючы, што "выбары" ў палату прадстаўнікоў адбываліся ва ўмовах бесрэцэдэнтных фальсыфікацыяў , падтасовак і маніпуляцыяў,

абапіраючыся на зьвесткі незалежнай сыстэмыназіраньня, што яўка выбарцаў у цэлым па краіне склала 45%,

падзяляючы ацэнку "выбараў" у палату прадстаўнікоў з боку міжнародных арганізацыяў як неадпаведных мінімальным дэмакратычным стандартам,

прымаючы пад ўвагу, што палата прадстаўнікоў зьяўляецца стратэгічным партнэрам Лукашэнкі й прыхільнікам палітыкі, праводзімай цяперашнім рэжымам, пацьвярджаньнем чаму ёсьць сямімесячная дзейнасьць палаты і прыманыя ёю рашэньні,

Каардынацыйная Рада дэмакратычных сілаў Беларусі

ацэньвае ініцыятыву збору подпісаў у падтрымку міжнароднага прызнаньня палаты прадстаўнікоў як дэструктыўную, палітычна небясьпечную і накіраваную супраць сувэрэнітэту Беларусі;

разглядае такія дзеяньні як адкрытую акцыю па падтрымцы цяперашняга рэжыму. Такім чынам асобныя прэтэндэнты на ўдзел у прэзыдэнцкіх выбарах імкнуцца выгандляваць у Лукашэнкі сваю рэгістрацыю ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты;

заклікае свах прыхільнікаў праводзіць сярод насельніцтва працу па вытлумачэньні сутнасьці й прызначэньня данай ініцыятывы.

**Менск**

**15 траўня 2001 году**

vytoki.net

# Віктар ІВАШКЕВІЧ: "Хай кожны з нас ня думае, што за яго зробіць іншы"

"Навіны БНФ" працягваюць сэрыю інтэрвію зь лідэрамі Фронту аб падрыхтоўцы да прэзыдэнцкіх выбараў. Сёньня мы папрасілі распавесьці пра распаўсюд агітацыйнай прадукцыі ў перадвыбарчы час намесьніка старшыні БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ, галоўнага рэдактара газэты "Рабочы" Віктара Івашкевіча.

– Спадар Івашкевіч, раскажыце, калі ласка, пра сыстэму распаўсюду агітацыйнай прадукцыі, якая зараз ствараецца.

– Наагул, паводле рэклямных тэхналёгіяў, каб людзі проста запомнілі назву чагосьці, трэба, каб яны пачулі, прачыталі ці ўбачылі яе як мінімум шэсьць разоў. Дванаццаць разоў неабходна, каб дасканала зразумець сэнс пэўнага паведамленьня. Агітацыйную кампанію мы плянуем правесьці зыходзячы з гэтых прынцыпаў.

Намі плянуецца некалькі відаў данясеньня інфармацыі да людзей. Па-першае – гэта разьмяшчэньне артыкулаў у незалежнай прэсе. Другое – спэцвыпускі газэтаў, тых незалежных выданьняў, якія пагодзяцца гэта рабіць і іх распаўсюд – раскіданьне па скрынях ці раздача ў рукі ў людных месцах, напрыклад, на рынках ці на вакзалах. На працягу лета мы плянуем выпусьціць ня менш за 12 відаў улётак і спэцвыпускаў.

**Віды дастаўкі інфармацыі на працягу выбарчай кампаніі павінны з максымальнай шчыльнасьцю і пэрыядычнасьцю паўтарацца.**

Трэба таксама адзначыць важнасьць раздачы друкаванай прадукцыі ў рукі на вакзалах і ў электрычках. Гэта для нас адзіны рэальны выхад на сельскія раёны. Іншыя выхады на вёску знайсьці будзе складана, таму што нашыя асноўныя структуры знаходзяцца ў гарадах і езьдзіць па вёсках у нас, хутчэй за ўсё, не атрымаецца. Таму давядзецца даставіць інфармацыю такім чынам. У звязку з тым, што агітацыйная кампанія прыпадзе на другую палову лета, гэтая праца будзе мець плён і для гарадзкіх жыхароў – бо ў сваіх гарадзкіх хатах людзі будуць мала, будуць у асноўным на дачах.

Трэцяе – гэта плякаты, налепкі. Чацьвертае – розныя варыянты значак, кепак – прадукцыя ў асноўным для тых, хто займаецца распаўсюдам, для актывістаў.

Вялікае значэньне мае абтэлефанаваньне. Мы рыхтуем людзей дзеля гэтага [illegible] тэлефанаваць і даваць людзям інфармацыю пра адзінага кандыдата.



Віктар Івашкевіч

Віды дастаўкі інфармацыі на працягу выбарчай кампаніі павінны з максымальнай шчыльнасьцю і пэрыядычнасьцю паўтарацца.

– Як плянуецца арганізаваць працу ў рэгіёнах?

– У найбліжэйшы час павінны быць вапрацаваны агульны лягатып – знак усёй кампаніі, – пад якім яна будзе праводзіцца. А далей такім чынам: плянуецца, што для буйных гарадоў цэнтралізавана будзе выраблядца адна прадукцыя, а для гарадоў менш вялікіх ці мястэчак – іншая.

Натуральна, што праблемы вёсак і маленькіх гарадкоў Гарадзеншчыны і Чарнобыльскай зоны значна розьняцца, у той час як праблемы жыхароў вялікіх гарадоў як на ўсходзе, так і на захадзе практычна аднолькавыя.

– Як бы Вы сёньня акрэсьлілі сытуацыю з вылучэньнем адзінага кандыдата?

– Насамрэч сытуацыя зараз горшая, чым магла быць, калі б усе дэмакратычныя кандыдаты, ці якія сябе называюць "дэмакратычнымі", згадзіліся б зь нейкім мэханізмам і вылучылі б адзінага спасярод сябе, а самі дапамаглі б яму перамагчы. Але на выпрацоўку такога мэханізму згаджаецца адзін толькі Сямён Домаш, які сам кажа, што згодны прызнаць лідэрства любога па аб'ектыўных крытэрах. Але больш ніхто на гэта не згаджаецца і ў гэтай сытуацыі склалася так, як склалася. Дзякуй Богу, што кандыдаты дамовіліся не выліваць на галаву адно аднаму кампраматы і контрапрапаганду.

**У нас абсалютна рэальныя магчымасьці скінуць сёлета Лукашэнку.**

Самае прыкрае ў гэтай сытуацыі, што права выбару адзінага дэмакратычнага кандыдата мы самі перадаем Цэнтральнай выбарчай камісіі, Лукашэнку й той жа Ярмошынай, якая будзе выбіраць. Усё гэта ёсьць вялікай праблемай. Але мы павінны працаваць на перамогу, і нашая першая задача сёньня – сабраць подпісы, каб улады былі пастаўленыя перад фактам.

Большасьць усіх партыяў, грамадзкіх арганізацыяў выказаліся ў падтрымку Домаша, раз выказаліся – трэба яго падтрымліваць. А там, хто найбольш актыўна будзе сябе паводзіць, той і стане рэальным кандыдатам.

– Вядома, што людзі, асабліва ў рэгіёнах, дэзарыентаваныя тым, што кандыдат дагэтуль ня вылучаны. Што б Вы маглі сказаць на гэты конт?

– Усе ведаюць сёньняшніх чатырох кандыдатаў. Усе, я маю на ўвазе тых, што чытаюць газэты. Бальшыня суб'ектаў Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў, у тым ліку і Фронт, выказалася ў падтрымку Сямёна Домаша з пазыцыяў найлепшых магчымасьцяў перамогі. Наш аналіз паказвае, што Домаш мае больш шанцаў перамагчы, чым астатнія і паводле асабістых якасьцяў, і паводле моцы структураў, якія могуць яго падтрымаць. Ну вось і ўсё. А што яшчэ трэба, якая шыльда "адзінага"? Хто гэтую лэйбу павінен паставіць? Кангрэс дэмсілаў? Паставіць у свой час. Дарэчы, я лічу, што гэта неабходная ўмова і гэта абавязкова будзе.

Адразу ж пасьля абвяшчэньня выбараў адбудзецца Кангрэс дэмакратычных сілаў, які зробіць гэтае прызначэньне. Зноў жа, думаю, што з гэтым прызначэньнем наўрад ці пагодзяцца той жа Казлоўскі ці Ганчарык. Дык лічыць таго, каго вылучаць, адзіным ці не лічыць? Што рабіць з кандыдатамі, якія не прызнаюць нікога акрамя сябе? У нас няма мэханізмаў іх адхіленьня ад выбарчай кампаніі, а на перакананьні яны пакуль не паддаюцца.

Мы павінны падтрымаць Сямёна Домаша, удзельнічаць у яго выбарчых

Працяг на стар. 5

vytoki.net

# Горад — наш!

### *120 бел-чырвона-белых сьцягоў па-над Беларусьсю*

У ноч з 13 на 14 траўня Малады Фронт правёў па ўсёй Беларусі шырокамаштабную акцыю "ГОРАД – НАШ!". У больш чым дваццаці гарадах і мястэчках Беларусі па-над дахамі вышынных будынкаў зьявіліся нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі.

Акцыя прымеркаваная да т.зв. "Дня дзяржаўнага сьцяга і гербу" – гадавіны сумнавядомага рэфэрэндуму аб скасаваньні беларускай сымболікі. Штогод, пачынаючы з 1997-га, маладафронтаўцы вывешваюць на дахах будынкаў дзясяткі нацыянальных сьцягоў, сьцьвярджаючы: "ГОРАД – НАШ!"

У Менску першыя сьцягі зьявіліся яшчэ з суботы на нядзелю. Так, насупраць кінатэатру "Зьмена" бел-чырвона-белая палатніна лунала больш за суткі; вялізны (4 на 2 м) сьцяг, вывешаны на дроце паміж двума дваццаціпавярховымі дамамі на скрыжаваньні вуліц Багдановіча й Варвашэні, быў зьняты ўдзень у нядзелю. На праспэкце Скарыны, насупраць Акадэміі навук, да дзьвюх гадзінаў дня трываў сьцяг памерам 1 на 2 мэтры. Таксама бел-чырвона-белыя сьцягі на дахах дзевяціпавярховых дамоў у нядзелю маглі назіраць жыхары вуліцаў Русіянава, Цікоцкага, Някрасава, Партызанскага праспэкту, праспэкту газэты "Известия", сталічных мікрараёнаў Зялёны Луг, Серабранка, Малінаўка, Вясьнянка, Усход.

Акцыя "ГОРАД – НАШ!" прайшла таксама ў Горадні, Магілеве, Берасьці, Бабруйску, Баранавічах, Пінску, Сьветлагорску, Слуцку, Салігорску, Рэчыцы, Крычаве, Стоўбцах, Заслаўі. Бел-чырвона-белыя сьцягі лunалі й па-над такімі мястэчкамі як Радашкавічы, Масты, Калодзішчы, Навасады. Палотнішчы былі ўзьнятыя па-над вышыннымі будынкамі над шматлюднымі скрыжаваньнямі й кірмашамі. У Віцебску, апроч сьцягоў на цэнтральных вуліцах Чарняхоўскага, Чкалава, на Маскоўскім праспэкце й Паўднёвым рынку, Малады Фронт правёў пэрформанс на пляцы Перамогі. Па-над грамадзкай прыбіральняй была ўзьнятая чырвоная зь зялёным палатніна, на якой у якасьці "гербу" прысутнічаў знаёмы вусаты твар. Блізу гадзіны інсталяцыя прыцягвала ўвагу мінакоў. У Рэчыцы беларускія нацыянальныя сьцягі былі ўзьнятыя па-над будынкам ВА "Нафтавік", харчовым рынкам і чыгуначным вакзалам. У Берасьці вялізнае бел-чырвона-белае палотнішча на 16-павярховым гмаху ў цэнтры гораду вісела амаль усю нядзелю.

На прэсавай канфэрэнцыі, праведзенай кіраўніцтвам Маладога Фронту у панядзелак, 14 траўня, Павал Севярынец зьвярнуў увагу на тое, што ў перадвыбарчы год сьлёган "ГОРАД – НАШ!" набывае незвычайную глыбіню й сэнс: 70% выбарнікаў і абсалютная большасьць моладзі жывуць у гарадах. Менавіта галасаваньне і арганізацыя супраціву ў гарадах вырашаць лёс прэзыдэнцкіх выбараў. "ГОРАД – НАШ!" – гэта сьцьвярджае перамогу.

# Беларускі сьцяг над Серабранкай

5 гадзінаў міліцыя, пажарныя й камунальнікі змагаліся зь бел-чырвона-белым сьцягам на вышыні 12-га паверху. За відовішчам назірала паў-Серабранкі.

Нацыянальнае палотнішча памерам 2х1 м зьявілася на дроце паміж двума 12-павярховымі дамамі на праспэкце Ракасоўскага каля крамы "Палесьсе" у ноч зь 19 на 20 траўня. Літаральна за сотню мэтраў адсюль – апорны пункт міліцыі і ЖЭС-85.

З самае раніцы ля пад'ездаў гмахаў пад сьцягам, задраўшы галовы, пачалі зьбірацца міліцыянты, супрацоўнікі ЖЭСу і мінакі. Спробы "ахоўнікаў парадку" проста стрэсьці сьцяг з дроту выніку не далі.

А 10-й раніцы пляцоўка між дамамі ўжо была запоўненая некалькімі сотнямі назіральнікаў.

Аб 11-й да натоўпу пад'ехала выкліканая пажарная машына. Але хлапцы абламаліся: выцягнутае лесьвіцы хапіла толькі на дзевяць паверхаў. Адзін з пажарнікаў адмовіўся лезьці ўвогуле, сказаўшы: "А мяне гэты сьцяг задавальняе". Міліцыянты лазілі на лесьвіцу па адным, балянсавалі на самае вяршыні канструкцыі і спрабавалі ўхапіць палотнішча рукамі. У 11.30 нейкі разумнік нарэшце здагадаўся выкарыстаць у справе даўгі дрын, але ў гэты час узьняўся вецер, і аднесены сьцяг быў зноў выратаваны.

Толькі праз гадзіну, з дапамогаю нейкае адмысловае прылады, сьцяг быў здабыты.

Такім чынам маладафронтаўцы Серабранкі яшчэ раз нагадалі жыхарам мікрараёну: набліжаецца прэзыдэнцкія выбары! Горад – наш!

## Акцыя за акцыяй

У сусьветны дзень Чырвонага Крыжа Малады Фронт правёў акцыю "Абаронім Беларусь ад мазаічнае псыхапатыі".

Дэлегацыя Маладога Фронту павіншавала Чырвоны Крыж праз ягонага прадстаўніка Ўладзімера Ярмоліна, якому маладафронтаўцы ўрачыста падаравалі карціну: вялізны чырвоны крыж, які перакрэсьлівае склееныя з кавалкаў мазаікі партрэт аднаго знакамітага вусатага псыхапата. Уладзімер Ярмолін прыняў падарунак і, у сваю чаргу, павіншаваў праз журналістаў усіх чырвонакрыжаўцаў.

Што характэрна, адбываліся гэтыя падзеі на вуліцы К. Маркса, літаральна за некалькі крокаў ад "эпіцэнтру" небясьпечнае хваробы.

**Матэрыялы рубрыкі падрыхтавала прэс-служба Маладога Фронту**



*Пачатак на стар. 4*

# *Віктар ІВАШКЕВІЧ:* "Хай кожны з нас ня думае, што за яго зробіць іншы"

штабах і зьбіраць подпісы. Да моманту рэгістрацыі ініцыятыўных групаў і сабраных подпісаў, я думаю, шмат што праясьніцца. Сабраць подпісы – гэта вельмі вялікая арганізацыйная праца, і такім чынам, вялікае сіта для самазваных кандыдатаў, якія думаюць сабраць подпісы сваім часовым творчым калектывам ці сямейным падрадам праз сваіх знаёмых і родных.

– Што б Вы параілі чытачам "Навінаў БНФ" напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў?

– У нас абсалютна рэальныя магчымасьці скінуць сёлета Лукашэнку. У нас вялікія магчымасьці, што пераможа ў [...] дат Домаш, адзіны з усіх, дарэчы, для якога беларуская мова родная. Але каб перамагчы – трэба прыкласьці максымум намаганьняў.

Што тычыцца фронтаўцаў, то трэба ў першую чаргу ўключыцца ў кампанію па зборы подпісаў (гэта на сёньняшнім этапе самае галоўнае), а таксама – у сыстэму распаўсюду інфармацыі й сыстэму назіраньня. Вось галоўныя кірункі працы, якія на працягу гэтых няпоўных чатырох месяцаў, што засталіся, трэба будзе зрабіць (месяц на падрыхтоўку, тры месяцы на інтэнсіўную працу). Гэта не такая вялікая ахвяра. Гэта ж не на год кідаць сям'ю, сыходзіць ў лес, паліць хаты… Некалькі гадзінаў пасьля работы ахвяраваць на тое, каб жыць потым у больш цывілізаванай краіне – не такія вялікія намаганьні, і чым больш людзей далучацца, тым меншы кавалак працы прападзе на кожнага.

Адна справа, калі некалькі сотняў чалавек мусяць сабраць сто тысячаў подпісаў. Зусім іншая, калі такой працай займаюцца некалькі тысячаў чалавек. Гэта ў дзесяць разоў лягчэй. Сёньня паводле сьпісу фронт мае пяць тысячаў сябраў. Калі кожны зь іх пойдзе ў ініцыятыўную групу, зьбярэ па сто подпісаў – гэтага паўмільёна хопіць. Разумеючы ўсё гэта, мы павінны разам працаваць, і хай кожны з нас ня думае, што за яго зробіць іншы, а сам зробіць унёсак у агульную справу.

**Падрыхтавала Марыя САВУШКІНА**

vytoki.net

# Зьмена сымболікі. Дзьве праблемы.

Кожны народ, што часткова можна сказаць і пра наш, ёсьць залежны ад сваіх сымбаляў. Калі ўсе іншыя прынцыпы жыцьця выпрацоўвае эліта, то сымболіка й мова належаць гісторыі, пакаленьням і ўсёй нацыі як гістарычнай супольнасьці. Яны кшталтуюцца ў гістарычным абсягу й ўплываюць на яе ідэнтычнасьць і самаідэнтыфікацыю. Атаясамленьне сябе з тым ці іншым знакам ёсьць права кожнага чалавека, але гэта права традыцыі. Толькі традыцыя й выхаваньне могуць спрыяць рэалізацыі гэтага права.




У кожным выпадку мы мелі дзьве традыцыі: адну – нацыянальную, што сягала да пэрыяду ВКЛ і Акту 25 Сакавіка, другую – камуністычную, што фармальна пачалася з утварэньня БССР. Другі кампанэнт – выхаваньне: за час савецкага панаваньня шанаваньне нацыянальных сымбаляў сталася справай фармальнай і рытуальнай. Чалавек перастаў атаясамліваць сябе зь якім-небудзь знакам-сымбалем як чымсьці інтымна Сваім. Так і з мовай нам даволі папулярна тлумачылі, што кошт на кілбасу не залежыць ад таго, на якой мове зьвяртацца да прадавачкі.

Атрымаўся вакуўм, які з 1991 году пачаў запаўняцца з падачы часткі эліта... старычным зьмесьцівам. Распачалася выбудова новае ідэнтычнасьці эўрапейскага кшталту. Гэтая сыстэма ідэяў вельмі хутка апанавала значнае кола людзей з гуманітарнай адукацыяй. Але большасьць чакала рэальнага эканамічнага эфэкту, а яго не было, ён мог зьявіцца толькі тады, калі сымбалі вызначалі калектыўную сьвядомасьць людзей. А гэта магчыма толькі пасьля 10-15 гадоў напружаных шуканьняў.




І калі знайшоўся чалавек, які сказаў: "Давайце зьменім сымбалі й зьменіцца жыцьцё", грамадзтва пайшло за ім. Гэта, можа, быў адзін з найвялікшых посьпехаў адраджэнцаў пачатку 1990-ых – грамада паверыла, што ад знака можа залежыць і жыцьцёвы ровень. І таму даволі ахвотна пагадзіліся на гэта.

Новы этап пачаўся тым, што новыя сымбалі ніхто па-сапраўднаму не шанаваў, але многія па-сапраўднаму ненавідзелі нацыянальную сымболіку, якая ў той самы час была для значнай часткі крэўнай. І нават спрэчкі вяліся выключна вакол нацыянальных сымбаляў. Савецкія ў лукашэнкаўскім варыянце ніхто й ня ўзгадваў, у сэнсе – не хваліў. Уся прапаганда ішла й ідзе на зьнявазе да "Пагоні", але пры гэтым нікому і ў галаву не прыходзіць хваліць "капусту".

Такім чынам, усё больш сацыяльных групаў пераконваюцца ў тым, што цяперашнія сымбалі часовыя. Але калі браць пад увагу, што яны непасрэдна ўплываюць на жыцьцё, то чым менш часу яны будуць дзяржаўнымі, тым лепш. Аднак тут тоіцца і свая небясьпека. Рэч у тым, што са зваротам савецкай сымболікі, вяртаецца й стаўленьне да яе, а гэта значыць і да ўсялякай іншай (шмат моладзі падчас спартовых спаборніцтваў выкарыстоўвае чырвоназялёныя палотнішчы). Мы можам прыйсьці да сытуацыі перад 1991 г. Каб гэтага ня здарылася, патрэбны хаўрус усіх элітных груповак у гэтай справе, замежная падтрымка пастаноўкі пытаньня і напружаная выхаваўчая праца сярод насельніцтва.

Ролю, якая ў будучыні будзе належыць бел-чырвона-беламу сьцягу й "Пагоні", цяжка пераацаніць. Зь іхным увядзеньнем адчыняцца межы, пойдуць інвэстыцыі, адродзіцца культура і ўзаемаразуменьне ўнутры краіны. Нам жа трэба толькі адно – добра ведаць: сымбаль патрэбны грамадзяніну й нацыі, а не абывацелю й дзяржаве.

**Андрусь УНУЧАК**

vytoki.net

# Адкрылася выстава дзіцячага малюнку "Мая Радзіма – мая свабода"

5 траўня, ў памяшканьні Ўправы БНФ адчынілася выстава дзіцячага малюнку. Экспануецца больш за 40 дзіцячых працаў 36 аўтараў з усёй краіны.

Усе дзіцячыя малюнкі, прадстаўленыя на выставе, былі дасланыя на конкурс "Мая Радзіма – мая свабода", што прысьвячаўся ўгодкам абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Большасьць удзельнікаў – дзеці ад 7 да10 год. Арганізатарамі выставы й конкурсу выступілі грамадзкі рух БНФ "Адраджэньне", Грамадзкае аб'яднаньне "Дыярыюш" і Грамадзкае аб'яднаньне "Сакавік".

Журы ў складзе Вацлава Арэшкі ("Дыярыюш"), Арыны Вячоркі (культурніцкая камісія БНФ "Адраджэньне"), Яўгена Шунейкі (мастацтвазнаўца), Уладзімера Пучынскага (дзіцячая газэта "Раніца") адзначыла 10 лепшых працаў. Тры зь іх (па адной з кожнай узроставай катэгорыі), атрымалі гран-пры конкурсу. Імёны пераможцаў – Каця Масаловіч – 10 гадоў, Вольга Шкуратава – 14 гадоў, Марыя Красоўская – 7 гадоў.

Спэцыяльны пры́з быў уручаны Зьміцеру Савічу – самаму малодшаму ўдзельніку, якому ўсяго толькі 3 гады. Таксама спэцыяльнымі дыплёмамі журы адзначыла настаўніцаў Ірму Табушаву зь Менску і Тацьцяну Ганчарык – настаўніцу малюнку з Рускасельскай пачатковай школы Менскай вобласьці Вілейскага раёну. Іх вучні найбольш актыўна ўдзельнічалі ў конкурсе. Пераможцам ад Фонду "Сакавік" былі ўручаныя падарункі.

Тэматыка дзіцячых твораў – свабода, незалежнасьць, любоў да Радзімы, ўвасобленыя пры дапамозе розных мастацкіх прыёмаў, нацыянальнай сымболікі, хрысьціянскіх матываў і нават палітычных шаржаў.

У гэтым годзе конкурс "Мая радзіма – мая свабода" праводзіўся ўпершыню, але паводле словаў Арыны Вячоркі, выставы дзіцячага малюнку зараз плянуецца праводзіць штогод.



**Марыя САВУШКІНА**

---

**Рыгор БАРАДУЛІН**

## Відаць

Відаць, нас мала перылі,
Што цягне да імпэрыі
Пад сьцягам мусульманістым
З палітбюро іваністым.

## Прачнуўся

Прачнуўся ў пэўным месцы сьверб,
Каб замяніць спаконны герб.
Дух бальшавіцкі,
Ён жыве
Зь ідэяй –
Лёгкай дамаю:
Бі молатам па галаве,
Махай сярпом па самыя...
Што ж, хочаш жні,
А хочаш куй,
А ці ў парлямэнце такуй!

**Генадзь БУРАЎКІН**

...Ідзе ўкабінэтах высокіх гульня,
Бушуе манкуртаў гарластая рацьь:
Ці мову мяняць,
Ці дзяржаву мяняць,
Ці, можа, абедзьве суседу аддаць...

Усё, як у хворым прыдуманым сьне...
Ня дай Бог дажыць да часіны,
Калі
Унук нас на мове чужой пракляне
За тое,
Што родную не зьберагліі...




*Дзьмітры Савелаў, 14 год*

**Ніл ГІЛЕВІЧ**

Родная мова! Ты воч не расі!
Лёс твой – свабода.
Іменна ты незалежнасьць дасі
Духу народу.
Ты – чыя веліч, і моц, і краса
Толькі ўзыходзіць.
Ты – чыя слава наперадзе ўся
Ў тысячагодзьдзях.

І ён рашыў, што гэта "перамога"
Яго наступных "перамог" гарант
І што яму адкрылася дарога –
Ураз набыць усерасейскі ранг.

Ах, чуў бы ён, як рогатам абвальным
Затрэслася Масква: "Вот это честь!..
Увидишь скоро, шут провинциальный,
Какой твой ранг и кто такой ты есть!.."

**Міхась БАШЛАКОЎ**

## Сон перад рэфэрэндумам

Вось і ўсё.
Засталося
Апошнюю кропку паставіць.
І Айчыны грудок
Замяце назаўсёды зіма.
Вось і ўсё.
Мой народ
На апошняй сваёй пераправе:
Памірае народ,
Калі мовы ў народу няма...

Як даўно не чуваць
На Радзіме пяшчотнага слова,
Як даўно мой народ
Анямелы
Зацята маўчыць...
Вось і ўсё.
Больш няма
Ні народу,
Ні роднага слова...
І зьлятаюцца ўжо
Нашы вочы кляваць
Крумкачы...

Вось і ўсё.
Апускаюцца рукі
У роспачнай скрусе,
І нікога вакол.
Ды й я на зямлі не прарок...
Вось і ўсё.
І няма больш маёй,
І няма Беларусі...
Замятае зіма
Назаўсёды
Айчыны грудок...

vytoki.net

**Антон АЛЯШКЕВІЧ**

## Разьвітаньне з Пагоняй

Бывай жа, Рыцар наш!
Ды – не навекі!
Цябе, дайшоўшага да нас
церазь вякі,
Разьбілі ў пыл
духоўныя калекі:
Бязбожнікі,
душы гвалтаўнікі.

Хацеў данесьці
Ты Свайму народу
Сьвятло, Надзею,
Веру і Любоў.
І з Крыжам Эўфрасіньнеўскім
– Свабоду,
Каб нам ня быць
халопамі ізноў.

Сьціскае сэрца боль:
не ўратавалі
Таго, хто нас прыйшоў
абараняць.
Разьбілі, і спынілі,
і стрымалі,
Каб родны край
на вечны глум аддаць.

Бывай, Ваяру!
Не крыўдуй на люд свой!
Даруй, як ворагам сваім
Ты дараваў.
Сьпіць наш народ. Дай Бог,
каб ён прачнуўся,
Народ-манкурт
каб Беларусам стаў...



***Натальля РАДЗЕВІЧ, 10 год***
***"Адраджэньне адвечнага, шчырага, добрага – гэта наша свабода!"***

**Васіль САХАРЧУК**

## Манкурт

Ён страціў памяць.
Санцапёк
чужых ідэй, чужое мовы
так яго розум зьвёў убок,
што ўсё забыў ён да асновы.

"Няўжо, –
матуля падышла, –
не назавеш м я н е сваёю?
Мой родненькі, зь якога зла
такое сталася з табою?!"

"Няўжо, –
спыталася дачка, –
не назавеш м я н е сваёю?" –
і, як на кветцы матылька,
пагладзіла яго рукою.

"Няўжо с в а ё й не назавеш?" –
спытала мова
і з тугою
дала яму трагічны верш,
напісаны яго крывёю.

"Няўжо с в а ё й не назавеш? –
Радзіма падняла далоні. –
А п о м н і с я! –
бо я – найперш!
Вось сымбаль твой – мой герб Пагоні".

Ён герб усклаў на галаву,
а верша і не заўважае:
"Я вас сваімі назаву,
як хоць адну мой цар прызнае".

Нікога цар зь іх не прызнаў,
бо й сам зь дзяцінства быў бяспомны,
і хтосьці з прыдворных загадаў
паставіць ім за гэта помнік.

Стаіць у скуры двайніка
цар на пяску, бы ў цэнтры Рыму.
А долу –
маці і дачка.
А ў небе –
мова і Радзіма.

НавінЫ
Б Н Ф "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 14 (47), 22 траўня 2001 г, наклад 299 асобнікаў
...сплатна на правах нутра-

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск,а/с 42 , тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net